# ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

**Яноўскі Алег Антонавіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ: ІДЭІ, ПАМКНЕННІ, СТВАРЭННЕ

Падзеі антырасійскага паўстання 1830–1831 гг. прывялі да закрыцця добра вядомага ў Еўропе Віленскага універсітэта (1832). Дарэчы, як і Варшаўскага, да якога імкнулася моладзь з Беларусі (праўда, некалькі пазней указам Аляксандра II ад 8 чэрвеня 1869 г. ён быў адноўлены і набыў статус «імператарскага», «рускага» і асабліва падкантрольнага на прадмет лаяльнасці. Паўстанне ж першай паловы 1860-х гг. прывяло да закрыцця Горы-Горацкага земляробчага інстытута. У далейшым царскія ўлады баяліся пайсці на стварэнне ўніверсітэта ў «Паўночна-Заходнім краі », перш за ўсё, з-за магчымасці абудзіць тут праз студэнтаў заглушаныя рэцыдывы нацыянальна-палітычнага супраціву.

Напрыклад, да гэтай высновы прыйшла ў 1906–1907 гг. спецыяльная камісія імперскага Міністэрства народнай асветы. Спробы з боку гарадскіх уладаў Смаленска, Мінска, Віцебска пераканаць у тым, што ўніверсітэт стане «магутным рассаднікам рускай культуры на Беларусь», былі адхіленыя.

І толькі падзеі 1917 г. спрыялі рэвалюцыйным рашэнням і ў частцы відавочнай для большасці перспектыўна думаючых беларусаў праблемы. Ужо паміж лютым і кастрычнікам праблема Беларускага ўніверсітэта зноў актуалізавалася, хоць і без канкрэтыкі дзеянняў. Так, у сакавіку 1917 г. на з'ездзе беларускіх партый і арганізацый было толькі заяўлена пра неабходнасць пры першай магчымасці адкрыць у Беларусі вышэйшую навучальную ўстанову. Але не больш за тое. Праўда, універсітэт бачыўся і «рассаднікам» ведаў, і выразнікам інтарэсаў нацыянальнай дзяржавы, абрысы якой рэальна сталі выяўляцца ў абстаноўцы звяржэння старога рэжыму ўлады.

Першае дакладнае асэнсаванне ідэі і магчымых шляхоў ажыццяўлення неабходных дзеянняў па стварэнні менавіта «Беларускага ўніверсітэта» сфакусаваліся ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення Усебеларускага з’езда ў першай палове снежня 1917 г. Гэты з’езд, закліка765ны вырашыць карэннае палітычнае пытанне – быць ці не быць беларускай дзяржаўнасці, а калі быць, то ў якой форме, – натуральным чынам разглядаў і шляхі стварэння Беларускага ўніверсітэта як арганічнага складніка будучага палітычнага, эканамічнага, культурнага развіцця новай дзяржавы. На абмеркаванне быў вынесены ўніверсітэцкі праект, падрыхтаваны акадэмікам Я. Ф. Карскім. Дэлегаты з’езда

авацыямі сустракалі вучонага. У гэты час прафесар-гісторык М. В. Доўнар-Запольскі таксама рыхтаваў да разгляду свой варыянт структуры і вучэбна-метадычнага напаўнення будучага ўніверсітэта.

Аднак далей заслухоўвання інтэлектуальных прапазіцыяй справа не пайшла, так як з'езд быў разагнаны бальшавікамі. У хуткім часе Яўхім Карскі, расійскі акадэмік і былы рэктар імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта, падрыхтаваў праект статуту Беларускага ўніверсітэта для публічнага агляду. Наступны крок да ўніверсітэту зрабіў урад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Гэтая ўпершыню дэклараваная беларуская дзяржаўнасць праз Народны сакратарыят, як увасабленне ўлады, у пачатку 1918 г. ўзяла пад свой кантроль і арганізацыйнае суправаджэнне распрацоўку ўніверсітэцкага праекта. Першы народны сакратар асветы ва ўрадзе абвешчанай у сакавіку 1918 г. БНР Аркадзь Смоліч (у наступным прафесар-географ БДУ) ініцыяваў стварэнне ў красавіку 1918 г. падрыхтоўчай камісіі для адкрыцця ў Мінску Беларускага ўніверсітэта. У склад камісіі ўвайшлі многія з тых, хто ўжо горача агітаваў за гэтую ідэю падчас рэвалюцыйных падзей 1917 г., – сам А. А. Смоліч, названыя вышэй Я. Ф. Карскі, М. В. Доўнар-Запольскі і інш. Працягнулася «даводка» прапаноў Е. Ф. Карскага, а М. В. Доўнар-Запольскі 10 мая 1918 г. вынес на абмеркаванне свой праект сутнасных параметраў Беларускага ўніверсітэта [1, арк. 15, 15 адв., 16].

Сярод 19 пунктаў Мітрафан Віктаравіч прапанаваў кіраўніцтву БНР арыентавацца на стварэнне шасці факультэтаў (гісторыка-філалагічнага, фізіка-матэматычнага, юрыдычнага, камерцыйна-эканамічнага, медыцынскага і багаслоўскага), арганізаваць беларускія, польскія і літоўскія кафедры, што, па яго меркаванню, абумоўлена «нацыянальным характарам універсітэта». Мовай выкладання гісторык-беларус вызначаў рускую «з дапушчэннем у вядомых выпадках польскай».

Аднак ва ўмовах нямецкай акупацыі ўсе намаганні стварыць універсітэт былі марнымі. У тагачаснай палітыка-ваеннай сітуацыі не магала рэалізавацца і задума бальшавікоў (1918) аб пераводзе ў адзін з не занятых немцамі гарадоў (Віцебск ці Смаленск) Юр'еўскага ўніверсітэта. Як магчымы першы крок да ўніверсітэту намаганнямі Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Віцебску быў арганізаваны своеасаблівы лекторый па беларусазнаўству. Лекцыі чыталі будучы наш першы рэктар Уладзімір Іванавіч Пічэта, беларускія этнографы, краязнаўцы і будучыя супрацоўнікі Інбелкульту Павел Пятровіч Дземідовіч і Міхаіл Вінцэнтавіч Мялешка. Але гэты лекторый сабраў не так ужо шмат зацікаўленых. У Маскве ж Белнацкам паспрабаваў рэалізаваць сходны праект, хаця і названы больш смела – Беларускі народны ўніверсітэт. Ён бачыўся як бы правобраз такога жаданага

сапраўднага ўніверсітэта. У рэальнасці гэта былі толькі метадычна-пазнавальныя курсы па беларусазнаўству і «радзімазнаўству». І былі яны ў Маскве, а не ў Беларусі. Тэрмін іх існавання аказаўся зусім кароткім – з 11 ліпеня па 12 жніўня 1918 г. Справаздача загадчыка гэтага «універсітэта» П. Урбановіча канстатавала, што з 109 запісаўшыхся на лекцыі «учителей всех типов школ Белоруссии» фактычна іх наведвала толькі 57. Хаця і запрошаныя лектары (акадэмік Д. М. Анучын, гісторыкі У. І. Пічэта і А. М. Ясінскі, палітыкі-інтэлектуалы Е. С. Канчар і Дз. Ф. Жылуновіч, а ўсяго 16 чалавек), і слухачы «проявили … большой интерес к делу возрождения Белоруссии и ее изучению» [2, арк. 267].

Тым не менш, такая featuresрoзнавектарная праца, у тым ліку і праведзеная ўрадам БНР, не магла застацца без наступстваў. Бальшавікам пры распараджэнні ўладай неабходна было ўлічваць імкненне народаў былой Расійскай імперыі да рэалізацыі сваіх нацыянальных задач, да захавання і ўзбагачэння нацыянальных асаблівасцяў. Гэтаму ў поўнай меры адпавядала місія і сутнасць універсітэта. Нельга не адзначыць, што многія фігуры з першага складу беларускага кіраўніцтва (партыйнага, ўрадавага, Саветаў розных узроўняў) бачылі Беларусь у расійскім федэралізме. А таму ў ідэі «беларускага» універсітэта прысутнічала зашмат расійскага зместу.

Калі вызначыць этапы станаўлення «Беларускага» і, што важна, аднaчасова «Дзяржаўнага» універсітэта, то знакавым варта лічыць адно з першых рашэнняў новастворанай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь – дэкрэт ад 25 лютага 1919 г., стагоддзе якога мы адзначаем у гэтыя лютаўскія дні 2019 года. Тэкст дэкрэта за подпісамі старшыні Цэнтральнага выканаўчага камітэту Аляксандра Фёдаравіча Мяснікова і сакратара Аляксандра Мікалаевіча Антанікоўскага праз некалькі дзён надрукавалі газету «Звезда» і «Савецкая Беларусь». Дарэчы, лёс абодвух палітыкаў склаўся трагічна. Мяснікоў у 1925 г. загінуў пад час авіякатастрофы. Антанікоўскі ж пасля ваеннай і партыйнай кар’еры ў 1928–1931 гг. з’яўляўся рэктарам Віцебскага ветырынарнага інстытута, а ў 1937 г. быў расстраляны ў мінскай турме НКВД.

Нельга абмінуць важную дэталь: Дэкрэт быў прыняты пасля дастаткова грунтоўнай прапрацоўкі пытання. Вядома, што прадстаўнік беларускага пададдзела аддзела асветы нацыянальных меншасцяў Фёдар Турук «празандзіраваў» пытанне ў Наркамасветы РСФСР і высветліў, што Масква «признала принципиальную возможность в местностях, освобожденных от немецкой оккупации, ... учреждение университета...». І тады беларускі Наркамасветы сабраў прыватнае пасяджэнне (прысутнічалі А. Р. Чарвякоў, Я. Ф. Карскі, В. Л. Іваноўскі, Ф. Ф. Турук, Б. А. Тарашкевіч, А. С. Неканда-Трэпка, загадчыца Мінскга гараддзела народнай асветы М. Я. Фрумкіна і яе калега Бярозава). Марыя Фрумкіна

24 лютага зрабіла спецыяльны даклад з абгрунтаваннем перад Прэзідыўмам ЦВК ССРБ падстаў для адкрыцця ўніверсітэта ў Мінску [3, с. 181].

Патрэбна звярнуць увагу на тое, што той жа Мяснікоў (і не ён адзін) не з'яўляўся прыхільнікам менавіта «беларускага» універсітэта, бо бачыў Беларусь як натуральны складнік расійскай федэрацыі. Тым не менш, сваім лютаўскім дэкрэтам ЦВК толькі-толькі (1 студзеня 1919 г.) абвешчанай у Смаленску беларускай дзяржаўнасці намеціў канкрэтныя меры па стварэнні ў Мінску ўніверсітэта як універсітэта дзяржаўнага. Былі вылучаныя некаторыя грошы для першых дзеянняў у рэалізацыі задумы. І што найбольш важна – арганізавалі спецыяльную Камісію пры губернскім (Мінскім) камісарыяце народнай адукацыі. Як адзначалася, гэтую Камісію ініцыяваў намеснік камісара народнай асветы Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў (у складзе яе кіраўніка Я. Ф. Карскага, сакратара Духанава, прафесараў В. Л. Іваноўскага, Марэка, А. М. Васюцінскага, Андэрсана, Маслоўскага, урача С. Д. Камінскага, той жа М. Я. Фрумкінай і бібліятэкара Я. А. Гурвіч) [4, с. 36]. Яна правяла свай першае пасяджэнне 10 сакавіка 1919 г., на якім прагучалі прапановы стварыць спачатку «естественно-математический и социальный факультеты», «изъять для нужд университета помещичьи библиотеки», запатрабаваць ад камандзіра Заходняй дывізіі Славінскага «освободить здание коммерческого училища» і інш. [5; 4, с. 77]. Відавочна, што ў тых умовах зрушыць новую справу з нулявой адзнакі было занадта складана. Не ўсё было проста і ў сэнсе міжасабовых адносінаў, палітычных (і не толькі) поглядаў тых, каго лёс звязаў адной справай. Некаторыя нюансы перададзены ў грунтоўным артыкуле калегі М. Ф. Шумейкі (асабліва цікава і падрабязна апісаны ім перапетыі 1919–1921 гг. ва ўзаемаадносінах паміж членамі двух арганізацыйных камісій – Мінскай і Маскоўскай, успрыняцці іх савецкімі ўладамі) [6].

Праз кароткі час, ужо не з'яўляючыся старшынёй ЦВК ССРБ, а толькі членам ЦВК аб'яднанай Літоўска-Беларускай рэспублікі, для ўзгаднення першарадных пытанняў у Маскву выехаў А. Мяснікоў. Апроч усяго іншага яго місія мела мэту абгрунтаваць правамернасць лютаўскага ўніверсітэцкага дэкрэта. Зусім прагматычна і дакладна 22 сакавіка перад прадстаўнікамі расійскага Наркамасветы і беларускіх палітычных і навукова-асветніцкіх суполак на адмысловай нарадзе па арганізацыі дзяржаўнага ўніверсітэта Беларусі прагучалі ягоныя доказы аб тым, што ўніверсітэт неабходны Беларусі «по целому ряду соображений экономического, технического и культурно-бытового характера» [7, арк. 3]. Важна тое, што Мяснікоў падкрэсліў факт дзяржаўнай прыналежнасці ўніверсітэта ў Мінску – у адрозненне ад

«пралетарскіх», «народных», «нацыянальных», якія ўжо заявілі аб сабе ў Віцебску і Вільне.

Натуральна, што гэтая нарада прыняла рашэнне «признать необходимым и целесообразным стварыць пры аддзеле вышэйшых навучальных установ Наркамасветы РСФСР, апроч Мінскай камісіі, яшчэ і «Комиссию в Москве» у складзе 6 чалавек. Былі агучаныя больш за 10 прозвішчаў савецкіх чыноўнікаў і расійскіх навукоўцаў, якія ў самы бліжэйшы час павінны былі распрацаваць прапановы па арганізацыі трох факультэтаў, іх вучэбных праграмаў і планаў (спачатку ў ёй былі В. П. Волгін і М. М. Пакроўскі ад Наркамасветы, Ф. Ф. Турук, А. Ф. Мяснікоў, потым далучыліся прафесары У. І. Пічэта, М. К. Любаўскі і інш.).

Ужо 28 сакавіка 1919 г. на пасяджэнні Калегіі названага аддзела ягоны загадчык Вартан Тыгранавіч Тэр-Аганезаў, якога можна лічыць амаль што цэнтральнай фігурай Маскоўскай камісіі, характэрна па-чыноўніцку назваў сэнс сваёй місіі – «Отделом высших учебных заведений Наркомпроса предложено мне организовать Комиссию по организации Государственного университета Белоруссии». І адзначыў, што за тыдзень сваёй працы Камісія выказалася станоўча наконт неабходнасці «учреждения Белорусского университета в г. Минске» у складзе агранамічнага, прыродазнаўчага і эканамічнага факультэтаў, хаця іх калегі з Мінскай камісіі выказалі намер стварыць пяць факультэтаў [7, арк. 3, 4, 6–6 адв.]. Важна, што ў пастанове Калегіі ўтрымлівалася дакладная мэта: «Признать принципиально желательным открытие 1 мая в г. Минске Белорусского университета в составе факультета общественных наук...».

Калі на нарадзе 22 сакавіка выступоўцы выкарыстоўвалі тэрмін «Государственный университет Белоруссии» (той жа Мяснікоў падкрэсліваў, што «Минский Губисполком и Ц.И.К. Белорусской Республики высказались за открытие в Минске Государственного Университета»), то на Калегіі аддзела 28 сакавіка гаворка ішла зноў пра «Белорусский университет» [7, арк. 1, 6–6 адв.]. Між тым В. Т. Тэр-Аганезаў не раз выкарыстоўваў зусім спрошчаную назву, якая адлюстроўвала аб’ектыўныя намеры стварэння ўніверсітэта: для «Белоруссии» як часткі Расійскай савецкай федэрацыі. Гэтыя тэрміналагічна-лексічныя нюансы адпавядалі тагачасным рэаліям і сёння ўспрымаюцца ў кантэксце эвалюцыі палітычнага развіцця не толькі ўніверсітэцкай ідэі, а і пабудовы поўнавартаснай беларускай дзяржаўнасці.

У тых палітычных абставінах важнай праблемай з’яўлялася пытанне аб прыярытэтнасці для заходніх губерняў савецкай Расіі ўніверсітэта ў Смаленску або ў Мінску. І гэта нягледзячы на абвяшчэнне

ССРБ! Патрэбна было таксама прыняць у разлік факт зліцця савецкай Беларусі і савецкай Літвы ў адзіную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі з цэнтрам у Вільні. Партыйнае рашэнnне-«рэкамендацыя» аб стварэнні гэтага палітычнага двуўмвірата адбылося 16 студзеня 1919 г. у Маскве. Затым кіраўніцтва двух толькі-толькі абвешчаных рэспублік без асаблівых пярэчанняў 27 лютага 1919 г. афармілі атрыманую ўстаноўку на сумесным пасяджэнні ЦВК ССРБ і ЦВК ССРЛ. Тады ж у ССРБ на карысць РСФСР былі аднятыя Віцебская і Магілёўская губерні і беларуская частка Смаленскай губерні.

Адзіны СНК і 16 сумесных наркаматаў, у тым ліку асветы, які ўзначаліў польскі рэвалюцыянер Юльян Ленскі (Ляшчынскі), павінны былі зараз ўлічваць канкрэтыку інтарэсаў гістарычна і геаграфічна блізкіх, але ўсё ж вельмі розных народаў. Чакаць, што паляк-бальшавік будзе адэптам ідэі Беларускага, хаця і Дзяржаўнага, універсітэта, не даводзілася. Прыярытэтнасць Віленскага ўніверсітэта была бясспрэчнай – найстарэйшы ва Усходняй Еўропе быў зачынены па ўказу імператара расійскага Мікалая I і ў рэвалюцыйных абставінах павінен быў узнавіць сваю работу дзеля згуртавання літоўцаў.

Ва ўмовах інтэрвенцыі і Грамадзянскай вайны старшыня СНК Літоўска-Беларускай рэспублікі, літовец па факце нараджэння і гісторык па складу душы, Вінцас Сіманавіч Міцкявічус-Капсукас, ставячы мэту адрадзіць Віленскі ўніверсітэт, змог толькі ініцыяваць адкрыццё ў Вільні Працоўнага ўніверсітэта. Крыху раней намеры аднаўлення Віленскага ўніверсітэта пад польскай аўрай і з прапольскім зместам таксама больш былі падобныя на «палітычныя гульні», чым на рэальныя крокі па адраджэнні калі не ранейшых інтэрнацыянальна-інтэлектуальных асноў гэтага ўнікальнага для ўсёй Усходняй Еўропы ўніверсітэта, то хаця б па стварэнні новага ўніверсітэта – літоўскага. У шэрагу «універсітэцкіх рашэнняў» ўрада Літоўска-Беларускай ССР можна назваць і палітычна матываванае выдаленне ў маі 1919 г. з Мінскага педінстытута аднаго з самых прадуктыўных ідэолагаў і ініцыятараў Беларускага ўніверсітэта – прафесара Яўхіма Карскага. Яго нават падвергнулі ператрусу і арышту. Ён сам з-за абавязательства перад ЧК не пакідаць Мінск быў вымушаны на пасяджэнні Мінскай камісіі 24 красавіка 1919 г. адмовіцца паехаць у Маскву, каб змікшыраваць магчымыя наступствы «ультимативного требования подчинения» Маскоўскай камісіі (ультыматум быў дасланы два дні таму ў Мінск у адмысловай тэлеграме) [8, арк. 49].

Як можна меркаваць па сэнсу тэлеграмы ад 22 красавіка, не адразу паміж членамі двух Камісій склалася ўзаемапагадненне. На пасяджэнні Мінскай камісіі 27 красавіка 1919 г., на якім старшынстваваў Я. Карскі, з нейкай крыўдай вынеслі на абмеркаванне патрабаванні сваіх

маскоўскіх калег [8, арк. 53]. І на гэтым жа пасяджэнні вырашылі, што пакуль няма ўмоў адкрыць універсітэт 1 мая, як было запланавана Калегіяй аддзела ВНУ Наркамасветы РСФСР 28 сакавіка 1919 г. Між тым адна з актыўных прыхільніц стварэння БДУ, член Мінскай камісіі Марыя Якаўлеўна Фрумкіна праз публікацыю ў маскоўскай газеце «Жизнь национальностей» апавясціла, што адкрыццё ўніверсітэта ў складзе толькі аднаго факультэта сацыяльных навук «решено приурочить его открытие к первомайскому празднику» 1919 г. З яе слоў, Мінская камісія пастанавіла «принять все меры к сохранению и вызову (магчыма, «вывозу» – *А.Я.*) всех помещичьих библиотек» для стварэння бібліятэкі БДУ [9, с. 4].

Так што сумесная праца двух Камісій двух савецкіх дзяржаў па стварэнні БДУ не заўсёды ў складаны 1919 год аператыўна ўзгаднялася. Абставіны «непераадольнай сілы» былі настолькі вострымі, што нам сёння прыходзіцца здзіўляцца, што тым не менш універсітэцкая ідэя і планы не згаслі. Працэс стварэння беларускага Універсітэта ў яго дзяржаўным змесце і арганізацыйным суправаджэнні ўжо было складана спыніць. Ён не быў адсунуты ў бок як другасны беларускімі палітыкамі, а ў планах беларускай інтэлігенцыі ўсё больш канкрэтызаваўся. Перш за ўсё трэба было разабрацца з фінансавымі магчымасцямі. Спадзяванні на Маскву былі яўнымі – гэта і атрыманне прамой дапамогі, і падтрымка праекта ў розных яго складніках. Меліся планы і на ўнёскі мясцовых бюджэтаў Мінска і Мінскай губерні (такія сціснутыя геаграфічныя маштабы на 1919 г. мела Беларусь як пэўная палітычная адзінка). Цэнтральныя органы ўлады, якія ўвасабляла РСФСР, надаючы некаторыя паўнамоцтвы мясцоваму кіраўніцтву, трымалі сітуацыю пад сваім кантролем.

З часам праца двух Камісій наладжвалася. Усю вясну 1919 г. ішло абмеркаванне магчымай факультэцкай структуры, у першым прыбліжэнні распрацоўвалі навучальныя планы, імкнуліся падабраць навукова-педагагічныя кадры. І нават быў абвешчаны прыём заяў ад жадаючых стаць студэнтамі. Без сумесных актыўных і настойлівых дзеянняў вырашаць вялікія і малыя пытанні не ўяўлялася магчымым. Таму члены Камісій – вядомыя навукоўцы і педагогі – імкнуліся не столькі кіравацца палітычнымі матывамі, але дзейнічаць у канструктыўным, творчым накірунку. Пасля акупацыі Мінска польскімі войскамі летам 1919 г. Мінская камісія працягвала існаваць, хаця толькі мела магчымасць меркаваць аб варыянтах далейшай сваёй працы ў выпадку змянення палітычнага становішча. Камісія ж у Маскве фактычна прыпыніла дзейнасць.

Пасля вызвалення Мінска 11 ліпеня 1920 г. Чырвонай арміяй і паўторнага абвяшчэння ССРБ Мінская камісія зноў ініцыявала крокі да

аднаўлення працы па адкрыцці ўніверсітэта. Яна ўзнавіла дзейнасць пры Мінскім губернскім аддзеле народнай адукацыі. Пра гэта пісаў у «дакладной запісцы» народнаму камісару асветы ССРБ намеснік старшыні камісіі Д. М. Мейчык – ураджэнец Беларусі, выпускнік юрыдычнага факультэта імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта. Давід Маркавіч са шчырым энтузіязмам ў афіцыйнай паперы эмацыянальна адзначыў: «Комиссия по организации Белорусского Государственного Университета, возобновив свою деятельность после ухода польских войск из гор. Минска в августе 1920 г., тотчас приняла целый ряд решительных мер к созданию в сердце Белоруссии Научного Центра, который служил бы средоточием культурных ценностей молодого народа» [1, арк. 13].

Але ўсім было зразумела, што канчатковыя рашэнні маглі прымацца толькі ў Маскве. Тым больш, што фінансава і палітычна ССРБ цалкам знаходзілася ў залежнасці ад РСФСР. Безумоўнай дадзенасцю была поўная залежнасць ад Расіі савецкай і ў частцы рэалізацыі ўніверсітэцкага праекта. Паколькі галоўныя магчымасці для завяршэння распачатай справы знаходзіліся ў Маскве, небеспадстаўна выглядала жаданне зноў падцвердзіць рашэнне аб працягу падрыхтоўчых мерапрыемстваў.

Паказальная ў гэтых адносінах камандзіроўка (жнівень 1920 г.) у Маскву дэлегацыі членаў Мінскай камісіі, якая складалася з досыць розных людзей, якіх аб'яднаў Беларускі ўніверсітэт (Я. Ф. Карскі, Л. Б. Сляпян, С. Д. Камінскі, Н. К. Ярашэвіч). Розны быў іх шлях да ўніверсітэту, розным аказаўся і далейшы лёс. Напрыклад, Ніканор Казіміравіч Ярашэвіч падчас польскай акупацыі ўзначальваў Мінскую губернскую земскую ўправу, падтрымліваў погляды правых эсэраў, па перакананнях быў федэралістам і прыхільнікам цесных сувязяў з РСФСР. У лістападзе 1920 г. ён стане загадчыкам Мінскага палітэхнікума і будзе рабіць спробы ператварыць яго ў Беларускі дзяржаўны палітэхнічны інстытут. Але ўжо ў сакавіку 1921 г. яго арыштуюць за нібыта антысавецкую дзейнасць і ў пачатку 1923 г. вышлюць ў Ташкент [10, с. 32, 41, 48, 64].

Дэлегацыя з Мінска меркавала ў «высокіх ўладных кабінетах» дамовіцца аб аднаўленні работы Маскоўскай камісіі, узгадніць пералік факультэтаў, абмеркаваць пытанні прыцягнення да працы ў БДУ прафесараў і выкладчыкаў з РСФСР, прасіць аказаць фінансава-матэрыяльную падтрымку і інш. Таму паездка ў Маскву расцягнулася на цэлы тыдзень (11–18 жніўня 1920 г.). Галоўнае было пераканацца ў пазіцыі расійскіх уладаў па факце «декретирования открытия» БДУ.

Аказалася, што чыноўнікі Наркамасветы РСФСР былі і больш дэмакратычныя, і больш абыякавыя да праблем сваіх беларускіх калег,

чым гэта бачылася з Мінска. Падчас прыёму 11 жніўня 1920 г. беларускай дэлегацыі ўжо згаданым вышэй загадчыкам аддзела вышэйшых школ наркамата асветы Савецкай Расіі Вартанам Тэр-Оганезавым на просьбу ўдакладніць юрыдычны статус задуманага ўніверсітэцкага праекта быў дадзены зусім канкрэтны адказ: «Вопрос о декрете, ввиду объявления независимости Белоруссии и сохранения фактической связи её с Россией, может быть решен так же, как относительно Туркестанского университета». Як менавіта ўспрымаць апошнія словы, не было ўдакладнена. Сёння па іншых дакументах таксама немагчыма знайсці адказ наконт «вопроса о декрете», які праз паўтары гады пасля 25 лютага 1919 г. так проста падаваўся маскоўскім наркамаўскім чыноўнікам.

Праз тры дні (14 жніўня) на аўдыенцыі ў намесніка наркама асветы РСФСР Міхаіла Мікалаевіча Пакроўскага рускі гісторык і выбітны рэвалюцыянер-бальшавік афіцыйна канстатаваў, што Масква згодная з ідэяй адкрыцця ўніверсітэта ў Мінску, але павінны быць прадэманстраваны магчымасці «местных сил». Тым больш, дадаў ён, што «декрет об учреждении университета был в прошлом году опубликован в нормальном законодательном порядке», і гэта з'яўляецца юрыдычнай падставай для таго, каб пытанне аб універсітэце магло «двигаться местной властью» [1, арк. 17–22; 11, с. 54, 57].

Варта адзначыць, што сярод членаў беларускай дэлегацыі не было адзінства нават па прынцыповых пытаннях – што ж неабходна зрабіць, каб універсітэт адбыўся, і якім ён павінен быць па сваёй структуры і напрамках дзейнасці. Больш за тое, сакратар універсітэцкай Мінскай камісіі Л. Б. Сляпян напярэдадні паездкі ў Маскву напісаў на сямі старонках абгрунтаванне з адназначнай па сэнсе назвай – «К вопросу об учреждении Университета в Минске». Але ў ім ён, грунтоўна пазначыўшы ўсе «за» і «супраць», аб'ектыўна ацаніўшы каласальныя праблемы фінансавага, кадравага і нават ментальнага характару, выйшаў з прапановай пакінуць на час ідэю ўніверсітэта і заняцца ўмацаваннем пазіцый ўжо наяўнага педінстытута, які пакуль не здабыў статусу вышэйшай навучальнай установы. Тым не менш, ён у цэлым падтрымліваў ідэю Беларускага ўніверсітэта і нават зыходзіў не з яго «обычного вида», гэта значыць як толькі абласнога «научного и научно-учебного центра», але бачыў у ім паўнавартасны, маштабны «научный центр», «живой научный круг», бо «жизнь выдвигает потребность в интеллигентных работниках не узкой практической специальности, но с более широкой научной подготовкой…» [1, арк. 1–2 адв.].

Ужо неўзабаве Л. Б. Сляпян паставіў свой подпіс пад доказальным абгрунтаваннем неабходнасці хутчэйшага адкрыцця ў Мінску ўніверсітэта. Гэта абгрунтаванне, у развіццё папярэдніх, было дадзена

ў «Докладной записке для Московской Комиссии по открытию Государственного Университета в городе Минске». Не ўдаючыся ў канкрэтыку шчырых і пераканаўчых прапаноў і тлумачэнняў мінчан сваім маскоўскім калегам, звернем увагу толькі на тое, як складана давалася беларускім інтэлектуалам, узгадаваных і адукаваных ва ўмовах Расійскай імперыі, ўсведамленне прыярытэтнасці новага палітычнага становішча, у якім з пачатку 1919 г. знаходзілася хоць і невялікая, але ўсё ж цэнтральная частка этнічных беларускіх тэрыторый. У запісцы паказвалася, што «из всех областей Российской Республики Белоруссия с населением до 15 миллионов человек (в том числе до 10 миллионов белорусов) не имеет до сих пор ни одного Высшего Учебного Заведения», што «Белоруссия одна из самых обездоленных областей России во всех отношениях». Хоць наконт місіі ўніверсітэта – у палітычным, сацыяльным, адукацыйна-культурным прызначэннях – сумневаў не было: «Задача Правительства развить производительные силы страны, просветив народ и учредив такие центры, около которых сгруппировались бы все работники на указанных поприщах, а это может дать только Университет…» [1, арк. 11].

Беларуская дэлегацыя, задаволеная адказамі, канстатавала вынікі сваёй паездкі тым, што змагла высветліць, дакладней – «прояснить» – «юридическое положение вопроса о декретировании открытия Университета в Минске».

Апусціўшы дэталі вельмі складанай і супярэчлівай дзейнасці двух камісій па стварэнню Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пакінуўшы без падрабязнасцяў палітычныя і ваенныя абставіны, у якіх больш за год знаходзілася абвешчаная беларуская савецкая дзяржаўнасць, варта акцэнтаваць увагу на значнасці асобаснага фактару. Ён, у разнастайнасці праяў, і дазволіў у рэшце рэшт адбыцца ў Беларусі ўніверсітэту ў яго дзяржаўнай прыналежнасці і нацыянальным прызначэнні. Прыходзіцца адзначаць, што ледзь ці не кожны – ці то палітык ці вучоны-інтэлектуал, ці беларус або рэвалюцыйнымі віхурамі занесены ў малазнаёмую Беларусь рускі, украінец, габрэй, паляк, латыш, прадстаўнік іншага этнасу – усе яны ўнеслі сваю годную лепту ў справу стварэння «з чыстага ліста» класічнага ўніверсітэта ў Беларусі і для беларусаў.

Шматлікія выданні пра гэты час у гісторыі БДУ, якія пісалі нашы папярэднікі, што раз згадваюць пра рэальную дапамогу, што зыходзіла ад тагачасных расійскіх навукоўцаў з сусветным прызнаннем – фізіолаг раслін Клімент Аркадзьевіч Ціміразеў, аграхімік Дзмітрый Мікалаевіч Пранішнікаў, вучоны-аграном Аляксей Фёдаравіч Фартунатаў, заолаг і пчалавод Мікалай Міхайлавіч Кулагін. Гэта былі тыя, хто мог аказаць дапамогу толькі ў адносінах арганізацыі сельскагаспадарчага факультэту, які спачатку планаваўся да адкрыцця ў БДУ і меў

прыярытэтнасць перад іншымі. І так і не быў адкрыты. Пазней рэальны ўдзел прынялі хімік Абрам Маісеевіч Беркенгейм (старэйшы брат Барыса Маісеевіча Беркенгейма – аднаго з пачынальнікаў хімічнай адукацыі і навукі ў Беларусі), этнограф і літаратуразнаўца Мікалай Андрэевіч Янчук, медыкі Лазар Саламонавіч Мінор і Міхаіл Барысавіч Кроль і інш. Яны прыехалі ў Мінск, каб на месцы завяршыць падрыхтоўчую працу і забяспечыць адкрыццё ўніверсітэта.

На чатырох сумесных пасяджэннях дзвюх камісій, якія прайшлі 28–30 снежня 1920 г. і 3 студзеня 1921 г., былі выпрацаваны першачарговыя прапановы пакрокавых дзеянняў для адкрыцця «в особой в культурном и бытовом отношении области» свайго ўніверсітэта [1, арк. 13; 11, с. 54–57]. Аднак досвед тых, хто сабраўся, мог быць рэалізаваны толькі ва ўмовах праявы ініцыятыўнага разумення сутнасных рэчаў мясцовымі палітычнымі і інтэлектуальнымі сіламі. І такое разуменне было першасным! У дадзеным выпадку неперахадзячая роля належыць фактычнаму кіраўніку дзяржавы Аляксандру Рыгоравічу Чарвякову, наркаму асветы і ў хуткім часе прафесару БДУ Усеваладу Макаравічу Ігнатоўскаму. Нельга ў рэшце рэшт не адзначыць ролю партыйнага лідэра і таксама стаўшага прафесарам БДУ Вільгельма Кнорына. Гэты ўладна-інтэлектуальны сплаў і дазволіў рушыць наперад рэальныя арганізацыйныя намаганні па распачынанні дзейнасці Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта.

Сумесным рашэннем Мінскай і Маскоўскай камісій 7 сакавіка 1921 г. было створана Часовае праўленне БДУ. У складзе Уладзіміра Іванавіча Пічэты, Фёдара Фёдаравіча Турука і Захара Рыгоравіча Грынберга яно пачало сваю дзейнасць 16 сакавіка 1921 г. – «временно в Москве». Ужо 18 красавіка 1921 г. адмысловай пастановай Прэзідыўма ЦВК ССРБ быў афіцыйна зацверджаны спіс будынкаў, зямель і інвентара, якія пераходзілі ў карыстанне ўніверсітэта [12, арк. 9, 16; 13, арк. 3]. Маладая рэспубліка ў тыя гады мела вострую патрэбу ў высокакваліфікаваных кадрах: урачах, настаўніках, эканамістах, юрыстах. Менавіта на іх падрыхтоўку і быў зроблены акцэнт. Улічваючы агульны не вельмі высокі адукацыйны ўзровень тых, хто меў намер атрымаць вышэйшую адукацыю, быў прадугледжаны адмысловы рабочы факультэт для падрыхтоўкі рабоча-сялянскай моладзі да вучобы па ўніверсітэцкіх праграмах. У спецыяльную камісію па стварэнні рабфака ўвайшлі прадстаўнікі цэнтральных органаў партыі і ўрада (Вільгельм Кнорын, намеснік наркама асветы і пасля рэктар БДУ Іосіф Каранеўскі і інш.). І ўжо 1 чэрвеня 1921 г. 160 рабфакаўцаў селі за парты ў «Доме № 1 БДУ» – будынку былой гімназіі Канстанціна Фальковіча, які стаў шэраговым выкладчыкам гэтага факультэта.

Калегія Наркамасветы ССРБ з 8 ліпеня 1921 г. афіцыйна прызначыла кіраўніцтва БДУ – Праўленне, якое ўзначаліў рэктар, выбітны гісторык У. І. Пічэта. Разам з ім паўсядзённыя турботы аб БДУ былі ўскладзены на плечы У. Ігнатоўскага, М. Фрумкінай, Ф. Турука. Такім чынам, рэальныя рашэнні ў адносінах універсітэта сталі зыходзіць ад улад Беларускай рэспублікі! Яны былі як аператыўнымі, так і плённымі.

Урачыстае адкрыццё Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта прайшло ў гадавіну вызвалення Мінска ад польскай акупацыі – 11 ліпеня 1921 г. У будынку Мінскага гарадскога тэатра, там, дзе чатыры гады назад – у снежні 1917 г. – была агучана пакуль што «проста» ідэя Беларускага ўніверсітэта, сабраліся члены ўрада ССРБ, прадстаўнікі грамадскасці, навукоўцы, якія падрыхтавалі адкрыццё рэальнай дзейнасці Дзяржаўнага беларускага ўніверсітэта ў складзе пакуль усяго толькі медыцынскага факультэта, факультэта грамадскіх навук і рабфака. Цікава, што пасяджэнне, якое адкрыў наркам асветы ССРБ Усевалад Ігнатоўскі, пачалося познім вечарам, ў 21 гадзіну. Тым не менш хапіла часу на шэраг выступленняў прадстаўнікоў розных дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый, на прыняцце тэкстаў тэлеграм, якія сход паслаў У. Леніну, а таксама А. Луначарскаму, М. Пакроўскаму, В. Волгіну, Р. Грынбергу – тым расійскім адказным работнікам асветы, хто з 1919 г. прымаў актыўны ўдзел у арганізацыйных работах па стварэнню БДУ. Таксама тэлеграмы былі накіраваны ў адрас Расійскай і Украінскай АН, універсітэтаў Масквы, Петраграда і Кіева [14, с. 20–22].

Між тым патрэбна было дэкларацыі сходу рэалізаваць па ўсіх накірунках – набраць высокапрафесійны склад выкладчыкаў, завершыць хаця б у першым прыбліжэнні спрэчкі з ваеннымі, чыгуначнай школай і іншымі установамі з-за вучэбных карпусоў, дапрацаваць вучэбныя планы. аформіць на вучобу першых абітурыентаў і інш. Важна, што 9 верасня ў Маскве Дзяржаўны вучоны савет зацвердзіў шэраг прафесараў і выкладчыкаў для працы ў БДУ. Члены беларускага ўраду В. Кнорын, У. Ігнатоўскі, С. Каценбоген і інш. далі згоду на чытанне лекцыйных курсаў ва ўніверсітэце [15, арк. 46]. У кастрычніку на запланаваным факультэце грамадскіх навук былі створаны пяць прадметных камісій для далейшай арганізацыі вучэбнага працэсу. Гэта дало падставу на пасяджэнні Савета факультэта 16 кастрычніка 1921 г. прыняць рашэнне вызначыць 30 кастрычніка днём пачатку навучальнага года. Адкрыццё заняткаў у БДУ ва ўрачыстай абстаноўцы правялі апоўдні гэтага кастрычніцкага дня. І зноў гэтая знакавая падзея сабрала ўсіх першых прафесараў (каля 15), выкладчыкаў (каля 50), студэнтаў (каля 1300), а таксама прадстаўнікоў партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі. Пасля выступленняў афіцыйных асоб і абвяшчэння

прывітальных тэлеграм ад універсітэтаў і навуковых устаноў Расіі і Украіны з дакладам, канстатуючым праведзеную працу і вызначаючым першарадныя задачы, выступіў першы ўніверсітэцкі рэктар У. І. Пічэта.

На наступны дзень прафесар-масквіч Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю [16, с. 54]. Доўгачаканая мара аб стварэнні Беларускага ўніверсітэта, да якой так настойліва ішлі прадстаўнікі розных сацыяльных слаёў, палітычных партый і рухаў, ўвасобілася ў жыццё. Усімі ўсведамляўся відавочны факт – агульнымі намаганнямі быў узведзены не толькі «храм навукі», але і адно з моцных абгрунтаванняў беларускай дзяржаўнасці – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Характэрна, што ў першыя гады яго дзейнасці абавязковай вучэбнай дысцыплінай стала ў розных сэнсавых мадыфікацыях тэма "Гісторыя адукацыі" – у цэлым і ў прыватнасці на беларускіх землях. Нават у дзень урачыстага адкрыцця заняткаў ва ўніверсітэце адным з двух навуковых дакладаў, прачытаных перад прысутнымі, быў даклад (неўзабаве апублікаваны ў выглядзе навуковага артыкула) прафесара-педагога Івана Міхайлавіча Салаўёва – "Школа і задачы навуковай педагогікі". У ім навуковец акцэнтаваў увагу на тэзе, што «только объединение, близость и связь наук дают истинное знание», і таму «школа по самому смыслу своему является лабораторией первого научного труда своих питомцев» [17, с. 72]. А тым больш школа вышэйшая.

Ён, як і яго калегі-гуманітарыі, затым чытаў агульныя і спецыяльныя курсы па розных сюжэтах гісторыі адукацыі. Напрыклад, прафесар-гісторык Аляксандр Антонавіч Савіч знаёміў універсітэцкіх гуманітарыяў з асаблівасцямі этапаў свецкай і царкоўнай адукацыі на беларускіх і ўкраінскіх землях у XVI–XVII стст. Студэнтам габрэйскай секцыі педфака выкладчык Гілель Самуілавіч Аляксандраў выкладаў курс "Гісторыя габрэйскага народнай асветы і сучасная сістэма асветы БССР і СССР" [18, с. 35]. Адразу пасля адкрыцця БДУ адзін з яго найактыўных арганізатараў Фёдар Фёдаравіч Турук у першым нумары навуковага часопіса «Працы БДУ» прадставіў грунтоўны «Універсітэцкі летапіс». У ім аўтар разгледзеў шлях ад закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта да адкрыцця 30 кастрычніка 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён, хоць і беларус па паходжанні, тады яшчэ не змог ўгледзець у першую чаргу нацыянальнае, грамадскае і дзяржаўнае прызначэнне таго ўніверсітэта, да стварэння якога прыклаў свае намаганні. Канстатуючы, што БДУ «является одним из самых молодых в семье русских университетов с некоторыми особыми чертами, обусловленными местными этнографическими и политическими условиями и историческими причинами жизни края»,

ён быў вымушаны прызнаць, што «вся работа по организации велась главным образом на средства, отпускаемые Наркомпросом РСФСР. Особых сумм на строительство университета не было, равно как и фонда «патриотического приношения»» [3, с. 175, 207].

Больш за ўсіх "беларускія складнікі" і выключнасць прызначэння БДУ для народа і дзяржавы савецкай Беларусі агучваў з першых дзён сваёй працы ў Мінску Уладзімір Іванавіч Пічэта. У 1920-я гг. ён не раз выступаў у рэспубліканскай прэсе з публікацыямі пра цяжкі шлях, пройдзены беларусамі да свайго Універсітэту, аб ганаровай ролі інтэлектуалаў і інтэлігенцыі ў жыцці грамадства і дзяржавы, пра відавочную важнасць дзяржаўнай падтрымкі і разумення значэння вышэйшай адукацыі ва ўсіх сферах жыцця соцыўма [19–25]. У 1928 г. у "Працах БДУ" рэктар-гісторык апублікаваў абагульненае навуковае даследаванне па гісторыі станаўлення на беларускіх тэрыторыях менавіта вышэйшай школы [26, с. 3–19].

Не дзіўна, што ўніверсітэцкія інтэлектуалы з'яўляліся аднымі з актыўных і перакананых прыхільнікаў незалежнага існавання Беларусі, умацавання яе дзяржаўнасці. Якога б яны не былі паходжання, дзе б не нарадзіліся і атрымалі жыццёвае і грамадзянскае сталенне, але ўсе актыўна ўключыліся не толькі ў падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для беларускай рэспублікі. Не меней важнай сваёй місіяй яны лічылі быць актыўнымі на ніве палітычнай, уносіць свой уклад ва ўмацаванне тых асноў новай дзяржавы, якія былі закладзены ў пачатку 1919 г.

Цікавай падаецца ў гэтым сэнсе "Анкета", якую напрыканцы 1924 г. прапанавала рэдакцыя газеты "Звезда" прадстаўнікам беларускай інтэлігенцыі. Адказы былі надрукаваныя пад простай, але вельмі знакавай назвай: «Белорусские культурные работники о независимой Белоруссии (анкета)». Рэктар БДУ У. Пічэта, ягоныя калегі – прафесар-гісторык Дз. Жарынаў, прафесар-філосаф С. Вальфсон, выкладчыкі ўніверсітэта і адначасова супрацоўнікі Інбелкульта С. Некрашэвіч, А. Смоліч, Я. Лёсік, Якуб Колас, – а таксама рэктар Беларускага сельскагаспадарчага ўніверсітэта А. Кірсанаў выказалі абсалютную перакананасць у неабходнасці мацаваць і надалей так цяжка атрыманую беларусамі незалежнасць сваёй дзяржавы.

Уладзімір Іванавіч Пічэта правёў паралель паміж «старой суверенностью белорусских земель и новой» – гэта значыць паміж часамі існавання Вялікага Княства Літоўскага і пачаткам беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР. Ён падкрэсліў, што «Акт провозглашения независимости Белоруссии – новая страница в истории национально-политических судеб белорусского народа», а таму «…будущность находится теперь в его собственных руках». Гэтую гістарычную паралель працягнуў расіязнаўца Дзмітрый Аляксеевіч Жарынаў,

выказаўшы думку, што «Белорусская национальность ярко проявила себя в эпоху своего приобщения к западно-европейскому экономическому и культурному движению XVI в.», а таму «Акт 31-го декабря 1918 года имеет первостепенное политическое значение…».

У ацэнках тых, да каго звярнулася з «Анкетай» газета «Звезда», было зашмат патэтыкі ды пафасу, але ўсе адзначалі бясспрэчны факт, што з 1 студзеня 1919 г. адкрылася «новая эра в истории Белоруссии» (Сцяпан Некрашэвіч), што БССР за шэсць гадоў «стала одной из основных государственных единиц первого в мире Союза рабочих и крестьян» (Сямён Вальфсон), што абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці толькі праз многія гады атрымае «належную ацэнку», бо «акт пачынае сабою новую эпоху культурнага жыцця Беларусі» (Якуб Колас). Такой жа думкі пісьменніка і выкладчыка БДУ прытрымліваўся і ўніверсітэцкі філолаг Язэп Лёсік. Ён адзначыў, што «абвяшчэнне незалежнае С. Соц. Беларускае Рэспублікі мае значэньне такой агромністай важнасьці, якую нам, сучасьнікам, трудна нават прадставіць».

А вось яго калега – географ Аркадзь Смоліч – закрануў тэму «малаверных і варожых галасоў», якіх было нямала ў дачыненні неабходнасці ўсталявання беларускай дзяржаўнасці. Непасрэдны ўдзельнік палітычных супрацьстаянняў 1917–1921 гг. падкрэсліў, што на 1925 год «…сваім існаваньнем БССР найлепей давяла вялікую вартасць сваёй ідэі. Гэта выяўляецца ня толькі ў палітычным значэньні БССР, але ня менш і ў культурна грамадзянскім». Ён акцэнтаваў увагу на тым, што Беларусь «з закінутай, беднай расійскай провінцыі, адкуль уцякалі ўсе», за кароткі час пераўтварылася ў адну «з перадавых краін Саюзу». У ёй на 4 млн жыхароў створаны 4 вышэйшыя школы, разгарнулася шырока навуковая праца, «дапасаваная да мясцовых умоў». Беларусь перастала быць «беднай дэфіцытнай», а сама сябе корміць, і нават на «чорназёмнай, пшанічнай Ўкраіне зайздросьцяць Беларусі» [27].

І ў публікацыях, і ў навуковых працах, і ў рэальнай дзейнасці першага пакалення інтэлектуалаў савецкай Беларусі «чырвонай ніткай» праходзіла перакананасць у тым, што паняцці «дзяржава» і «універсітэт» непадзельныя ў сваіх сэнсавых дэфініцыях і ў сваім прызначэнні – служыць інтарэсам развіцця грамадства і кожнага яго члена, служыць інтарэсам як нацыянальным, так і інтэрнацыянальным.

У дадзеным выпадку яркім падцвярджэннем і ўмовай фарміравання падобнай перакананасці былі этапы, пройдзеныя Беларускім дзяржаўным універсітэтам у працэсе свайго станаўлення. Падагулім вышэй агучанае ў якасці фармалізаваных этапаў:

1) ад закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта да імкнення ўлад некаторых беларускіх гарадоў (Мінск, Магілёў, Віцебск, Орша)

атрымаць дазвол на стварэнне мясцовага, але імператарскага ўніверсітэта;

2) рэвалюцыйныя зрухі 1917 г. і абмеркаванне праекта Беларускага Універсітэта разам з праектамі беларускай дзяржаўнасці на Усебеларускім з’ездзе ў снежні 1917 г.;

3) спроба глыбокай прапрацоўкі шляхоў і магчымасцяў рэалізацыі ўніверсітэцкага праекта, нароўні з звярхактуальнымі палітычнымі пытаннямі, урадам Беларускай Народнай Рэспублікі вясной–летам 1918 г.;

4) дэкрэт ад 25 лютага 1919 г. і рэальныя крокі урада ССРБ, Мінскай і Маскоўскай камісій па стварэнні ўмоў арганізацыі дзейнасці «Государственного университета Белоруссии» у лютым–маі 1919 г.;

5) прапрацоўка дэталяў праекта «Беларускі Дзяржаўны Універсітэт» членамі Мінскай камісіі ва ўмовах польскай акупацыі летам 1919 г. – летам 1920 г.;

6) стварэнне ўрадамі РСФСР і ССРБ летам 1920 г. – у пачатку восені 1921 г. паўнавартаснай арганізацыйнай, матэрыяльна-фінансавай, кадравай, метадычнай базы для пачатку працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

7) 30 кастрычніка 1921 г. – ўрачыстае абвяшчэнне прадстаўнікамі беларускай улады, беларускай грамадскасці, універсітэцкай прафесуры і выкладчыкаў, студэнцтва, інтэлектуальнай эліты ССРБ адкрыцця рэгулярных заняткаў у БДУ.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.
2. НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 81.
3. Турук Ф. Университетская летопись // Труды Белорусского государственного университета в Минске. – Минск, 1922. – № 1. – С. 175–207.
4. Школа и культура Советской Белоруссии. – Бобруйск, 1919. Апрель. – № 1.
5. Звезда. 1919. 23 марта.
6. Шумейко М. Ф. К вопросу о роли академика Е. Ф. Карского в создании Белорусского государственного университета // Проблемы славяноведения. Сб. научных статей и материалов. – Брянск: РИО Брянский гос. ун-т, 2016. Вып. 18. – С. 115–138.
7. НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 131.
8. НАРБ. Ф. 4-п. Воп.1. Спр. 52.
9. Фрумкина М. К вопросу о Белорусском университете // Жизнь национальностей». 1919. Москва. № 12 (20).
10. Кукса А. Н. Н. К. Ярошевич – первый ректор Белорусского государственного политехнического института. – Минск, 2011. – 87 с.
11. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт, 1921–1941 / склад.: С. М. Ходзін і інш. – Мінск: БДУ, 2006. – 383 с.
12. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 6.
13. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 6.
14. Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1921. Октябрь. № 1.
15. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 9.

16. Вальфсон С. Я. Адрыўкі з успамінаў і думкі // Беларускі дзяржаўны унівэрсытэт, 1921–1927: да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. – Менск, 1927. – С. 52–55.
17. Соловьев И. М. Школа и задачи научной педагогики // Труды Белорусского государственного университета в Минске. – Минск, 1922. – № 1. – С. 67–73.
18. Агляд выкладаньня на пэдагогічным факультэце Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту у 1927–28 ак. г. – Менск, 1927. – 68 с.
19. Пичета В. Интеллигенция и Октябрьская революция // Звезда. 1922. 7 ноября.
20. Пічэта У. Наш першы выпуск // Савецкая Беларусь. 1925. 20 лютага.
21. Пічэта У. Беларускае адраджэньне XVI веку і сучаснае беларускае нацыянальна-культурнае адраджэньне // Савецкая Беларусь. 1925. 4–12 жніўня.
22. Пічэта У. Юбілей Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту // Маладняк. 1926. – № 7–8.
23. Пічэта У. Юбілей Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту – сьвята працоўных мас // Савецкая Беларусь. 1926. 5 снежня.
24. Пічэта У. Савецкая ўлада і пытаньне аб адчыненьні ўніверсітэту на Беларусі // Савецкае будаўніцтва. 1928. № 6. – С. 137–144.
25. Пічэта У. Беларускі дзяржаўны універсытэт і Кастрычнік // Савецкая Беларусь. 1928. 7 лістапада.
26. Пічэта У. Пытаньне аб вышэйшай школе Беларусі ў мінулым // Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 1928. № 19. – С. 3–19.
27. Звезда. 1924. 28 декабря.

**Василевич Григорий Алексеевич**
*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

## ЗАКОНОДАТЕЛЬНЫЕ ОСНОВЫ РАЗВИТИЯ БЕЛАРУСКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ НА РУБЕЖЕ ВЕКОВ (1991–2019)

Обычно политические процессы, особенно когда речь идет о становлении государственности, получают свое законодательное подкрепление. Это характерно также и для белорусской государственности, получившей свое новое, качественное развитие с начала 1991 г. Этот период был насыщен важными событиями, которые шаг за шагом приближали распад СССР и обретение пятнадцатью республиками государственного суверенитета.

Именно 1991 год стал переломным: был завершен распад СССР и начато масштабное строительство независимого белорусского государства. Фоном этого стали следующие крупные политические события и важные законодательные решения. Особое место среди законодательных актов Верховного Совета в сфере государственного строительства занимает принятый 27 февраля 1991 г. Закон «Об основных принципах народовластия в Республике Беларусь». Первоначально имелось в виду подготовить Декрет о власти: такие акты были приняты в некоторых других республиках Союза ССР, например, России. В них республиканские законодатели стремились пересмотреть свои взаимоотношения с центром, перераспределить властные полномочия. Закон об основных приниципах народовластия включал в себя как те положения, которые